# Максім Багдановіч
# «Вянок»



# У зачараваным царстве

Верагодна, Максім Багдановіч захапляўся беларускай культурай, вывучаў міфалагічныя паданні і апісанні багоў. Гэта і паўплывала на яго творчасць, уяўленне.

## Вадзянік

Сівавусы, згорблены, я залег між цінай
І гадамі грэюся – сплю на дне ракі.
Твар травой аблутана, быццам павуцінай,
Засыпаюць грудзі мне жоўтыя пяскі.

Над вадой ля берага ціха спіць асока,
Ды лаза зялёная жаліцца-шуміць,
Хвалі ціха коцяцца і бягуць далёка, –
І ўсё навокала сном адвечным спіць.



# Згукі Бацькаўшчыны

Цыкл «Згукі бацькаўшчыны» — шчырае і высокапаэтычнае адлюстраванне задушэўных пачуццяў і настрояў простага чалавека.



## Сумна мне, а ў сэрцы смутак ціха запявае...

Сумна мне, а ў сэрцы смутак ціха запявае:
«Сцежка ў полі пралягае, траўкай зарастае.
Каля сцежкі пахіліўся явар да каліны, –
Там кахаліся калісь-то хлопец і дзяўчына.

# Старая Беларусь

Паэтычнай творчасці Максіма Багдановіча былі ўласцівы і такія тэмы, як гістарычны лёс Беларусі, паднявольнае становішча беларускага народа, яго барацьба за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне.

## Слуцкія ткачыхі

Ад родных ніў, ад роднай
хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.
І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць
яны…



# Места



## Ад спёкі пышуць дахі і асфальт…

Ад спёкі пышуць
дахі і асфальт,
На вуліцы ўецца
пыл і грукаціць
фурманка;
«Каробушку» пяе
дзіцячы альт,
І надрываецца
абрыдлая
шарманка…

# Думы

## **Жывеш не вечна, чалавек…**



Жывеш не вечна,
чалавек, –
Перажыві ж у
момант век!

Каб хвалявалася
жыццё,
Каб больш разгону
ўім было…

# Вольныя



## Вы кажыце мне, што душа у паэта…

Вы кажаце мне,
што душа у
паэта,
Калі спараджае
ён дзіўныя
вершы,
Нябесным
агнём абагрэта,
І ў час той між
люда ён —
першы...

# Старая спадчына

У раздзеле «Старая спадчына» аўтар прадставіў розныя, малавядомыя віды верша: пентаметр, актава, трыялет.

## Санет



Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі,
Над хвалямі сінеючага Ніла,
Ўжо колькі тысяч год стаіць магіла:
Ў гаршчку насення жменю там знайшлі.

Хоць зернейкі засохшымі былі,
Усё ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.

# Мадонна



Вершаванае апавяданне «*Вераніка*» — успамін пра дзяўчыну, якая непрыкметна для аўтара, «*ў красе свае вясны*» вырасла, абудзіўшы ў душы паэта першае каханне, а з ім — цягу да ідэальнага, прыгожага, да паэзіі. Музай для Максіма Багдановіча паслужыла Ганна Какуева, сястра яго аднакласніка, таленавітая піяністка.

Дзякую за ўвагу!